7. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.). – 1975. – 640 с.
8. *Жилянин, Я. А.* Без линии фронта / Я. А. Жилянин, И. Б. Позняков, В. И. Лузгин. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : Беларусь, 1979. – 382 с.
9. *Хацкевич, А. Ф.* Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР / А. Ф. Хацкевич, Р. Р. Крючок. – Минск : Наука и техника, 1980. – 320 с.
10. *Мацко, А.* Боевое братство партизан / А. Мацко // Коммунист Белоруссии. – 1982. – № 9. – С. 46–53.
11. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т., 1983–1985. – Т. 1. – 1983. –591 с.
12. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т., 1983–1985. – Т. 2 – 1984. – 551 с.
13. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Л. Аржаева [и др.] ; редкол.: А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983–1985. – Т. 3 / Л. В. Аржаева [и др.] ; редкол.: А. Н. Мацко [и др.]. – 1985. – 531 с.

**Л. А. Осіпава, Г. С. Хадасевіч**

# ПАРТЫЗАНСКІ РУХ НА ТЭРЫТОРЫІ ПІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

1941–1944 гг. – вызначальныя гады ў гісторыі Беларусі XX ст. Вялікая Айчынная вайна прынесла шмат страт і пакут беларускай зямлі. Вайна закранула кожную беларускую сям'ю, але беларускі народ здолеў выстаяць і арганізаваць дастойны адпор ворагу. Насельніцтва гарадоў і вёсак стварала партызанскія і падпольныя атрады. Адным з першых куткоў Беларусі, дзе узнік партызанскі рух, быў Пінскі раён.

Падрыхтоўка да партызанскай вайны на Беларусі на выпадак вайны з нацысцкай Германіяй ці Польшчай пачалася яшчэ ў 1930-я гг. Згодна з загадамі савецкага Генштаба стваралася законспіраваная сетка дыверсійных груп і адзіночак у гарадах і на чыгунках, арганізоўваліся манеўраныя партызанскія атрады, ствараліся базы забеспячэння ўсім неабходным. Так, у схронах былі закладзены боепрыпасы, амуніцыя, шмат харчавання, каля 50 тыс. вінтовак, 150 кулямётаў, узрыўчатка. Кіравалі гэтай работай партыйныя органы і камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі І. П. Убарэвіч. Усяго было створана 6 тэрытарыяльных партызанскіх атрадаў – Бабруйскі, Барысаўскі, Мінскі, Мазырскі, Полацкі і Слуцкі, у складзе 300–500 прафесіяналаў, якія прайшлі абучэнне ў спецыяльных закрытых школах. На чале атрадаў стаялі вопытныя кіраўнікі – удзельнікі партызанкі ў гады першай сусветнай і антыпольскай барацьбы пачатку 1920-х гг.: С. А. Ваўпшасаў,

В. З. Корж (адзін з лідэраў будучай партызанскай барацьбы на Піншчыне і ў БССР), К. П. Арлоўскі, А. М. Рабцэвіч [1, с. 245]. Аднак у 1937–1938 гг. гэтыя работы былі звернутыя – большасць «тайных» партызан была рэпрэсіравана, атрады ліквідаваны, схроны перададзены арміі. У выніку гэтага у 1941 г. партыйнаму і ваеннаму кіраўніцтву ўсю работу па стварэнню падпольнай і партызанскай сеткі прыйшлося весці з нуля.

Асноўныя задачы і метады, а таксама характар разгортвання партызанскага руху былі зададзены шэрагам распараджэнняў партыйных і савецкіх органаў агульнасавецкага і рэспубліканскага маштабу. 29 чэрвеня 1941 г. была выдадзена Дырэктыва СНК СССР і ЦК УКП(б), якая патрабавала стварэння ў захопленых раёнах партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп, падрыву мастоў, парушэння ліній сувязі, падпальвання складоў, стварэння невыносных умоваў для акупантаў. 30 чэрвеня 1941 г. у дадатак да гэтай дырэктывы ЦК КП(б)Б прымае новую «Аб пераходзе на падпольную работу партыйных арганізацый раёнаў, занятых ворагам», а 1 ліпеня – «Аб разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага», у якой больш канкрэтызаваліся мэты і задачы партызанскай барацьбы, вызначаліся сродкі сувязі і метады канспірацыі і г.д. [2, л. 6].

Як толькі стала вядома аб нападзе фашыстаў, у Пінскі абкам партыі пачалі збірацца кіруючыя работнікі, камуністы, камсамольцы. З запісак В. З. Каржа: «Приехала за мной обкомовская машина, шофер, которой сказал: “Сегодня на рассвете разбомбили Жабинковский аэродром. Всех работников вызывают в обком” » [3, с. 52–53]. У кабінеце першага сакратара сядзеў ужо другі сакратар П. Р. Шапавалаў. Ішла напружаная работа. Заходзілі людзі, атрымоўвалі заданні і хутка разыходзіліся па сваіх месцах. В. З. Корж паставіў пытанне аб арганізацыі партызанскіх атрадаў... «Атрымалася невялікая замінка, – успамінаў В. З. Корж, – бо не было зверху на гэты конт указанняў. Але яны вельмі правільна паступілі: узялі на сваю рызыку арганізацыю партызанскага атрада...» [3, с. 54]. Один из участников заседания вспоминает об этом так: «К исходу третьего дня войны в обкоме партии мы обсудили создавшееся положение дел и в качестве первостепенной задачи приняли решение создать свой отряд по обороне города Пинска. Во время нашего разговора в кабинет вошел заведующий финансовым сектором обкома Корж В. З. по своим хозяйственным делам. Мы спросили его мнение, кого бы он рекомендовал назначить командиром создаваемого отряда. Он ответил: “Поручите мне это дело”. Мы знали его положительные качества, знали как человека, имевшего большой опыт революционной подпольной борьбы, участника испанских событий, награжденного орденами за свои заслуги» [4, с. 109].

24 чэрвеня СНК СССР прыняў пастанову «Аб мерапрыемствах па барацьбе з парашутнымі дэсантамі праціўніка ў прыфрантавой паласе», на падставе якой вечарам было прынята рашэнне аб стварэнні Пінскага знішчальнага батальёна з 60 чалавек, які ўзначаліў В. З. Корж.

Для разумення працэсаў, якія адбываліся на акупаванай тэрыторыі, для аналізу дзейнасці партызанскіх атрадаў неабходна зразумець – хто яны, партызаны: па узросту, прафессійным, ідэалагічным характарыстыкам и г.д. Пасля стварэння дакладнага партрэта партызан Піншчыны з'явілася магчымасць лепш зразумець матывы іх дзейнасці, асноўныя фактары, што вызначылі лёс соцень тысяч чалавек. Быў атрыманы адказ на пытанне, чаму адны ішлі ў партызаны і рызыкавалі жыццем, іншыя заставаліся дома і нават не спрабавалі выканаць грамадзянскі абавязак.

Неабходна адзначыць, што характэрныя паказчыкі: колькасць, узрост, пол, матэрыяльнае забеспячэнне будуць адрозніваццa па перыядах вайны. Па-першае, тэрмін узнікнення. Напрыклад, з 20 партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Пінскага раёна (якія былі ў наяўнасці на момант вызвалення) на 1 студзеня 1943 г. існавалі толькі 5 атрадаў, а 10 (50 %) узніклі ў апошнія 8 месяцаў акупацыі [1, с. 244–248]. Для тых жа 20 партызанскіх атрадаў Піншчыны прычынамі іх стварэння сталі:

– партыйны загад (2);

– былыя ваеннапалонныя (2);

– спецгрупы НКУС (1);

– стыхійныя аб'яднанні грамадзян (4);

– рэарганізацыя існаваўшых атрадаў (11) [1; 6].

Так, В. Корж узгадваў, што першапачаткова яго атрад складаўся з трох стралковых аддзяленняў па 20 чалавек у кожным. Было і аддзяленне разведкі з 6 чалавек. Атрад быў цесна звязаны з насельніцтвам: «В состав отряда вошли работники обкома партии, горкома, обкома и горкома комсомола, милиции и других учреждений. В основном отряд состоял из коммунистов и комсомольцев. Беспартийных не было. Отряд насчитывал примерно 60 человек» [3, с. 59].

Відавочна, што ва ўмовах 1941–1942 гг. нельга казаць аб масавым грамадскім уздыме і партызанскім руху. Гаворачы ў справаздачы 1942 г. аб складанасцях пачатковага арганізацыйнага перыяду, Корж са шкадаваннем адзначаў: «25 ліпеня 1941 года мой намеснік т. Бярэзін паставіў пытанне, каб сыходзіць за фронт, да яго падабралася яшчэ чалавек 18 нэндзаў, малаверы, спалохаўшыся цяжкасцяў. Мая забарона і доказы, што гэтага нельга рабіць, апынуліся нямоглымі таму, што там, дзе наш атрад праходзіў, ніякіх партызанскіх груп і атрадаў не было, а тыя, якія і знаходзіліся, усе сышлі за фронт ... 26 ліненя 1941 г. 19 чалавек на чале з Бярэзіным сышлі за фронт, засталіся больш сумленныя і адданыя патрыёты нашай Радзімы» [1, с. 255–256].

Вызначальным стаў 1942-і год. У маі гэтага года быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. На чале ЦШПР быў пастаўлены кіраўнік ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка [7, с. 12]. У верасні 1942 г. ствараецца Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР) пад кіраўніцтвам сакратара ЦК КП(б)Б П. З. Калініна. Ён адыграў станоўчую ролю ва ўдасканаленні пабудовы

і кіраўніцтва, а таксама забеспячэнні зброяй, узрыўчаткай, радыёсувяззю, каманднымі кадрамі. З дапамогай штабоў арганізацыя партызанскіх сіл Беларусі набыла ў 1942 г. якасна новыя рысы. Шырокае распаўсюджанне атрымала атрадная форма арганізацыі партызан. Атрад стаў асноўнай баявой адзінкай ўзброеных патрыётаў. Атрады аб'ядноўваліся ў брыгады. З цягам часу брыгады ўтваралі вышэйшыя формы аб'яднання – занальныя і абласныя партызанскія злучэнні, першыя з якіх на тэрыторыі Беларусі з'явіліся ў другой палове 1942 г. Працэс арганізацыі партызанкі завяршыўся ў 1943 г., адзінкі ўсё болей набывалі вайсковую пабудову – што было заканамерна, вельмі значную частку складалі кадравыя ваенныя ці асобы з вопытам вайсковай службы. У сваей дысертацыі Я. Я. Паўлава падкрэсліла вызначальную ролю гэтай групы ў партызанскіх фарміраваннях Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей [8, с. 11]. Брыгады ў асноўным складаліся з атрадаў, якія дзяліліся на ўзводы, аддзяленні. У некаторых брыгадах і палках існавалі таксама батальёны, у атрадах – роты. Апрача таго, існавалі партызанскія палкі і ваенна-аператыўныя групы.

Напрыклад, у лістападзе 1942 г. Пінскі падпольны абкам КП(б)Б з аб'яднаных атрадаў стварыў партызанскае злучэнне вобласці. Яго камандзірамі былі В. З. Корж, А. Я. Кляшчоў, начальнікам штаба злучэння – М. С. Фядотаў. На базе арганізацыйнай групы Ф. С. Кунькова ў Старобінскім раёне Пінскай вобласці быў створаны міжраённы штаб для каардынацыі дзеянняў партызанскіх сіл у падкантрольных яму раёнах. Зімой 1942–1943 гг. штаб накіроўваў баявыя дзеянні атрадаў імя С. Г. Лазо, А. В. Суворава, М. І. Кутузава. Вясной сюды прыбыў атрад імя М. Ц. Шыша. Гэтыя аб'яднаныя атрады стварылі партызанскую брыгаду імя В. М. Молатава. Фарміраванне брыгад у вобласці працягвалася. Прычынай таму быў рост партызанскіх сіл за кошт прытоку мясцовага насельніцтва, уцекачоў з фашысцкіх канцлагераў і гета, дыверсійных спецыяльных груп і атрадаў, якія прыбывалі з савецкага тылу. Аб'яднаныя ў брыгады партызаны маглі наносіць больш моцныя ўдары па ворагу. Ужо ў студзені 1944 г. у вобласці дзейнічалі 7 партызанскіх брыгад і адзін асобна дзеючы атрад. Колькасць партызан у гэты час дасягала 2 тысяч чалавек. Кожная брыгада кантралявала 1–2 раёны.

Дыслакацыя партызанскіх атрадаў мела свае заканамернасці. Картаграфічныя дадзеныя Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь утрымліваюць 38 карт дыслакацыі на ўсёй тэрыторыі БССР ад 10 жніўня да 27 ліпеня 1944 г. Інфармацыйная нагрузка карт была стандартызавана. Партызанскі атрад В. Каржа, атрад ім. А. В. Суворава, атрад ім. М. І. Калініна і інш. адправілі ў БШПР больш 120 карт з расшыфроўкай свайго размяшчэння, з пазначанымі аэрадромамі, колькасцю асабовага складу. Карты даюць магчымасць зразумець дынаміку перамяшчэння партызанскіх рэсурсаў. Відавочна, што кіраўніцтва БШПР актыўна выкарыстоўвала гэтыя дадзеныя для больш эфектыўнай дзейнасці. За 1943 г. толькі ў Пінскім, Драгічынскім і Лунінецкім раёнах былі вылучаны 11 новых партызанскіх атрадаў з мэтай

закрыцця «белых плямаў» на карце партызанскай барацьбы (атрад імя Г. Арджанікідзе – з атраду імя А. Суворава; атрад імя І. Сталіна – з брыгады імя В. Молатава і г.д.) [9, с. 41–42].

Па сацыяльным складзе асноўная частка партызанскіх атрадаў на Палессі была неаднародная і залежыла ад спосабу камплектавання. Калі разглядаць рэгіён у цэлым, то прадстаўнікі сялянства складалі каля 28 %, працоўныя каля 32 %, служачыя і інтэлігенцыя каля 18 %, вучні агульна-адукацыйных школ і студэнты каля 14 % [8].

Працэс арганізацыі партызанкі завяршыўся ў 1943 г., адзінкі набылі вайсковую пабудову – што было заканамерна, значную частку складалі кадравыя ваенныя ці асобы з вопытам вайсковай службы. На партызан і членаў іх сем'яў распаўсюджвалася і заканадаўства па пенсійнаму забеспячэнню, кіраўніцтва краіны здолела максімальна забяспечыць партызан і іх сем'і сродкамі да існавання і сацыяльна іх абараніць. Асноўную частку партызан складалі мужчыны 18–40 гадоў, удзельная вага жанчын у Пінскай вобласці складала 6,8 %, а 70 % партызанак Піншчыны не дасягнулі на пачатак залічэння 26-гадовага ўзросту [10, с. 19].

Разгортванне партызанскага руху мела дзве галоўныя мэты, якія можна прасачыць у дакументах партыі і ўрада. Найбольш відавочная – гэта мэта ваенная. Яе сутнасць у тым, каб зрабіць як мага больш цяжкімі ўмовы існавання нямецкіх войскаў на захопленай тэрыторыі, а таксама парушаць сродкі камунікацыі, асабліва чыгунку, што значна ўскладняла пастаўкі на фронт і манеўранасць вермахту. Другая мэта – больш глабальная, палітычная [11, л. 2]. Сутнасць яе ў тым, каб надаць партызанскаму руху ўсенародны характар. Гэтага патрабавалі ўмовы ідэалагічнай вайны. Неабходна было не дапусціць аніякага паразумення паміж нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй і мірным насельніцтвам, якое апынулася пад акупацыяй.

Баявыя дзеянні партызанскіх атрадаў на Піншчыне можна ўмоўна падзяліць на некалькі напрамкаў: па-першае, дыверсіі на нямецкіх камунікацыях (у тым ліку на чыгунцы, шасейных і рачных магістралях); па-другое, знішчэнне ўмацаваных цэнтраў нямецкіх войск (апорныя пункты, пастарункі, камендатуры); па-трэцяе, знішчэнне матэрыяльна-тэхнічных запасаў нямецкага камандавання (склады боепрыпасаў, запасы збожжа, лесу, паліва і іншых відаў карыснай сыравіны для нямецкай прамысловасці і фронту); па-чацвёртае, фізічнае знішчэнне прадстаўнікоў нямецкага кіраўніцтва і калабарацыяністскіх арганізацый. Храналагічна баявыя дзеянні партызан Піншчыны амаль цалкам супадаюць з агульнай перыядызацыяй.

Каб пакончыць з дзейнасцю «лясных бандытаў», а таксама ліквідаваць, адлавіць салдат-акружэнцаў, у ліпені – жніўні 1941 г. была здзейснена першая буйнамаштабная карная аперацыя пад назвай «Прыпяцкія балоты». Пад час яе правядзення карнікі знішчылі мірных жыхароў і акружэнцаў – усяго 13 788 чалавек. Аперацыя паўплывала на змяненне ў гэтым рэгіёне адносін мірнага насельніцтва да немцаў: яны з нейтральных перараслі

ў варожыя [12, с. 39]. Тым не менш, восень 1941 г. вызначаецца як крызіс партызанкі. Цэнтральнае маскоўскае кіраўніцтва больш цікавілася падзеямі на франтах. Да гэтага часу ні з Масквой, ні з Чырвонай Арміяй сувязі не існавала. Партызаны не ведалі, што адбывалася на франтах, а нямецкая прапаганда выкарыстоўвала гэта для дэзінфармацыі як мірных жыхароў, так і партызан. Аб'яўлялася аб захопе Масквы і Урала, што вызывала ў жыхароў маральны крызіс. Вялікая няўпэўненасць была і з тым, як доўга працягнецца вайна. Да таго ж, у атрадах не было зброі і боепрыпасаў, харчавання і цёплай вопраткі. У выніку жорсткіх карных мер акупантаў частка атрадаў была разгромлена, а іншыя, не атрымаўшы падтрымкі ад насельніцтва, распаліся ці перайшлі на паўлегальнае становішча. Але і ў зімовых умовах каля 200 партызанскіх атрадаў і груп працягвалі ўзброеную барацьбу [13, с. 77].

Не ўсе прадстаўнікі партызанскага руху вытрымалі цяжкасці «ляснога» жыцця і ў Пінскай вобласці: частка байцоў атрада В. Каржа рушыла за лінію фронту. У жніўні ў атрадзе засталося ўсяго 16 чалавек, але гэта былі надзейныя, смелыя і баяздольныя партызаны. Атрад В. З. Каржа – адзін з нешматлікіх, які здолеў, нягледзячы на складаны перыяд фарміравання, захавацца арганізацыйна, забяспечыць рост сваіх радоў, накапіць баявы вопыт, стаць з часам пагрозай для ворага. У гэтым была заслуга яго камандзіра. Ён наладзіў у атрадзе жалезную дысцыпліну, падтрымліваў высокі маральны дух людзей. Умела манеўруючы, пераходзячы з раёна ў раён (з Жыткавіцкага ў Старобінскі, затым у Любанскі), атрад выстаяў, знайшоў падтрымку ў мясцовага насельніцтва. Усё гэта дазволіла партызанам перажыць зіму 1941–1942 гг. [14, с. 470].

У лістападзе 1941 г. да атрада В. З. Каржа далучыўся атрад М. Бандараўца, некалькі груп, якія рухаліся на ўсход, астаткі асобнага атрада імя К. Я. Варашылава, якім камандаваў Б. Міхайлоўскі. Ды і сам В. З. Корж аб'яднаў вакол сябе разрозненыя групы з Целяханскага раёна. Устанавіліся цесныя сувязі з атрадамі Міншчыны і Палесся – А. І. Далідовіча, А. П. Пакуша, А. І. Патрына, М. М. Розава, Г. М. Сталярова (Жоры) і іншымі.

Улетку 1942 г. у Пінскай вобласці дзейнічала ўжо 7 атрадаў (2 000 партызан) [7, с. 219]. Яшчэ ў верасні сюды прыбыў у якасці ўпаўнаважанага ЦК і сакратара абкама А. Я. Кляшчоў, які, разам з Каржом, пачаў ствараць Пінскае злучэнне. Камандзірам стаў Корж, але да сакавіка 1943 г. ён заставаўся і камандзірам атрада «Камарова». Дзякуючы павышэнню баявой актыўнасці атрадаў злучэння партызанская зона значна пашырылася. К зіме 1942/43 г. яна заняла амаль усю тэрыторыю Ленінскага і Ганцавіцкага раёнаў, значную частку Лунінецкага, Жыткавіцкага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага, Іванаўскага і іншых раёнаў. У кожнай вёсцы прызначылі каменданта народных мсціўцаў. Без яго дазволу ніхто не мог нічога ўзяць у селяніна. Камендант падпарадкоўваўся камандаванню атрада, да якога пры размеркаванні адносілася вёска, і быў адказны толькі перад ім. Такім чынам, у партызанскай зоне аднаўлялася Савецкая ўлада, толькі пакуль без сельскіх саветаў. Іх стварылі пазней, летам 1943 г.

Шырылася падтрымка з боку насельніцтва. Вось некаторыя выпадкі: юнак з вёскі Обруб Лунінецкага раёна гаечным ключом забіў фашысцкага афіцэра і з яго зброяй прыйшоў да партызан; камсамолка з в. Чэрабасава Вера Янкевіч знішчыла 14 фашыстаў (спаліла разам са сваёй хатай). Такіх выпадкаў было вельмі шмат. Часам да партызан прыходзілі і былыя акупанты, у асноўным – не немцы, а салдаты іншых нацыянальнасцей. Напрыклад, бельгіец Жозэф Дэвіск. 3 студзеня 1944 г. цягнік, на якім ён разам з іншымі салдатамі вёз дровы з Чучавіч у Ганцавічы, падвергся нападу атрада імя Шчорса. Скарыстаўшы момант, Дэвіск забіў афіцэра і ўцёк да пінскіх партызан [3, с. 133–134].

Спецыфіка Пінскай вобласці ў дадзеным пытанні ўскладнялася наяўнасцю несавецкага партызанскага руху, прадстаўленага дзейнасцю украінскіх палітычных арганізацый і вайсковых фарміраванняў. Паводле падлікаў беларускіх гісторыкаў, на тэрыторыі Беларусі пад час Другой сусветнай вайны дзейнічала 12 тыс. чалавек – сяброў АУН. У 1944 г. у Берасцейскай, Пінскай і Палескай абласцях падпольныя структуры АУН і партызанскія аддзелы УПА разгарнулі антысавецкую барацьбу. Паводле падлікаў У. Гуленкі, у Пінскай вобласці напрыканцы 1943 г. дзейнічала 114 аддзелаў АУН–УПА (ад 25 да 500 чалавек у кожным). Мясцовае партыйнае кіраўніцтва было вымушана, асабліва ў 1941–1942 гг., без дырэктыў з цэнтра выпрацоўваць узаемаадносіны з дадзенымі атрадамі. С. Бандэра нават прапаноўваў В. З. Каржу сумесныя дзеянні, аднак «Камароў» – у асноўным з-за адсутнасці афармленай партыйнай пазіцыі – адмовіўся [10].

У пачатку ліпеня 1944 г. войскі 1-га Беларускага фронту наблізіліся да Піншчыны. Наперадзе іх чакалі жорсткія баі. У цяжкапраходных Пінскіх балотах, поймах рэк Прыпяці, Піны і Ясельды, гітлераўцы стварылі моцную лінію абароны, горад Пінскператварылі ў непрыступную крэпасць. Дзеянні пінскіх партызан ускладнілі і зацягнулі перадыслакацыю 4-й, 5-й нямецкіх танкавых дывізій з Украіны на Беларусь і 28-й пяхотнай дывізіі з групы армій «Поўнач». На суседніх станцыях, побач з Лунінцом, сканцэнтравалася вялікая колькасць нямецкіх эшалонаў, што дало магчымасць савецкай авіяцыі па партызанскай падказцы разбамбіць тэхніку праціўніка.

Па дамоўленасці з камандзірам Пінскага партызанскага злучэння В. З. Каржом кіраўнік 61-й арміі перакінуў частку войскаў з-пад Мазыра і Калінкавіч у раён Століна, адкуль сумесна з партызанамі быў нанесены флангавы ўдар уздоўж Прыпяці. Адной з галоўных мэт, пастаўленых перад мясцовымі партызанамі, было перашкодзіць пераправе ворага праз Случ у раёне Старобін-Грабава. Гэту задачу вырашала брыгада імя Будзённага. Яе асабовы склад на працягу 30 чэрвеня – 5 ліпеня 1944 г. вытрымаў 8 сутычак з рэгулярнымі войскамі праціўніка, што дазволіла сарваць пераправу. У выніку групіроўка нямецкіх войск пад кіраўніцтвам генерал-палкоўніка В. Мілера аказалася заціснутай паміж Чырвонай арміяй і партызанамі і капітулявала [17, с. 369]. На хвалі вызвалення партызаны пачыналі спяшацца і рабілі памылкі: у ноч на 9 ліпеня 1944 г. партызаны 208-га палка паспрабавалі ўсімі сіламі захапіць Лагішынскі гарнізон, аднак страцілі амаль 60 чалавек.

21 ліпеня на цэнтральнай плошчы Пінска адбыўся святочны мітынг з удзелам кіраўнікоў усіх партызанскіх злучэнняў Пінскай вобласці. Прысутнічалі сакратар падпольнага абкама партыі С. Р. Вайцаховіч, В. З. Корж, начальнік штаба злучэння М. С. Фядотаў, начальнік разведкі Г. П. Сцешыц, Б. С. Ляўчэня, А. У. Майсеевіч. Аб выніках барацьбы Пінскага партызанскага злучэння дакладваў начальнік штаба М. С. Фядотаў. Ён называў толькі лічбы: «з чэрвеня 1941 па 15 ліпеня 1944 г. злучэннем разбіта 65 фашысцкіх гарнізонаў, знішчана 26 616 гітлераўцаў, узята ў палон 422, спушчана пад адхон 468 эшалонаў, знішчана 585 пар цягнікоў, 4 587 вагонаў і платформаў, 65 цыстэрнаў з палівам, 770 аўтамашын, 86 бронемашын і танкаў, 62 чыгуначныя масты, падарвалі 23 616 рэек...» [15, с. 112].

Увесь перыяд акупацыі партыйныя і камсамольскія органы актыўна праводзілі масава-палітычную работу сярод партызан і насельніцтва. Яна была накіравана на фарміраванне жорсткай пазіцыі ў адносінах да акупантаў. Выкарыстоўваліся гутаркі, лекцыі, сходы па святах, друкаваныя ці рукапісныя газеты і лістоўкі. Праз «Суражскія вароты» прайшло на Беларусь больш за мільён экземпляраў рознай прапагандысцкай літаратуры, савецкіх газет і часопісаў. Праз «вароты» было дастаўлена некалькі мабільных друкарняў, і да канца 1943 г. пачало выдавацца каля 140 найменаванняў газет, у тым ліку 65 на беларускай мове, што гаворыць аб іх арыентацыі на простае насельніцтва Беларусі.

Сярод партызан і насельніцтва Піншчыны былі папулярнымі газеты «Палеская праўда», Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б і «Партизан Полесья», якую выдаваў Іванаўскі РК КП(б)Б. Газета «Палеская праўда» пачала выходзіць з мая 1943 г. 2 разы на тыдзень накладам 120–130 экзэмпляраў. Яе першым рэдактарам быў І. Р. Ганчарык, з верасня 1943 г. яе рэдагаваў М. А. Эрдман [7, с. 48]. Выдаваліся шматлікія лістоўкі, адозвы пад рознымі назвамі – «Вести с фронтов», «Не дадим фашистам нашего добра», «Все на борьбу с врагом», «Что ты сделал для Родины» і іншыя. З рук у рукі перадаваліся газеты, якія з Вялікай зямлі прывозілі летчыкі. Зместам газет і лістовак з’яўляліся дадзеныя зводак Саўінфармбюро, якія ўмацоўвалі ўпэўненасць у непазбежным разгроме нямецкай машыны, раскрывалі сутнасць «новага парадку».

Аб размаху палітычнай работы партызан сведчыць справаздача камандавання атрада імя А. В. Суворава, які дзейнічаў на Піншчыне, накіраваная ў Беларускі штаб партызанскага руху. У ёй паведамлялася, што за перыяд з 23 лістапада 1942 г. па 1 мая 1943 г. сярод насельніцтва было распаўсюджана 10 200 экзэмпляраў радыёзводак, 310 экзэмпляраў загада Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 23 лютага 1943 г., 140 вытрымак з выступлення дэпутата Вярхоўнага Савета СССР пісьменніка А. Талстога, 320 матэрыялаў Упраўлення па прапагандзе і агітацыі ЦК ВКП(б), 210 выступленняў Е. М. Яраслаўскага, 460 зваротаў да насельніцтва [16, с. 72]. І гэта дадзеныя аднаго атрада за 6 месяцаў!

Цікавай старонкай партызанскага жыцця стала школьная справа ў партызанскіх зонах. Шырокае распаўсюджванне такой з'явы былі вымушаны прызнаць і нямецкія ўлады, адзначыўшы, што «існуючая школьная сістэма прасякнута лібералізмам і бальшавізмам». Пасля канферэнцыі настаўнікаў, арганізаванай К. Мазуравым і М. Зімяніным у першай палове 1942 г. у Акцябрскім раёне, масава пачалі ствараць лясныя школы. Першымі падхапілі ініцыятыву Старобінская, Любанская і Пінская партызанскія зоны. На тэрыторыі партызанскай зоны, якую кантраляваў атрад В. З. Каржа, у сярэдзіне 1943 г. працавалі 32 пачатковыя школы! У Пінскім раёне ў весках Хорастава і Чаланец такія школы адпрацавалі больш двух навучальных гадоў [17, с. 10].

Такім чынам, партызанскі рух на Піншчыне з'яўляецца класічным узорам развіцця супраціўлення ў БССР. Аднак, у адрозненне ад Усходняй Беларусі, ідэалагічная барацьба ў Пінскай вобласці ўскладнялася недальнабачнай палітыкай савецкага ўрада ў 1939–1941 гг. і наяўнасцю разгалінаванага нацыяналістычнага ўкраінскага і польскага рухаў. Аднак можна сцвярджаць, што ў ідэалагічным супрацьстаянні пінскія партызаны і падпольшчыкі таксама, як і ў ваеннай сферы, перамаглі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Памяць: гіст.-дак. хроніка Пінскага раёна / гал. рэд. Г. К. Кісялёў. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 624 с.

2. Национальный архив Республики Беларусь (НА РБ). – Ф. 4-п. Оп. 3. Д. 1209 / Директива ЦК КП(б)Б партийным, советским и комсомольским организациям по развертыванию партизанской войны в тылу врага от 1 июля 1941 г.

3. *Корж, К. С.* Вся жизнь – Отчизне / К. С. Корж. – Минск : Беларусь, 1984. – 238 с.

4. *Шевела, Г. Н.* Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне: документы и материалы / сост. Г. Н. Шевела. – Минск : Беларусь, 1988. – 495 с.

5. *Манаенков, А. Л.* Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) / А. Л. Манаенков. – Минск: Беларусь, 1983. – 344 с.

6. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память: в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 2. – 358 с.

7. Всенародная борьба в Белоруссии против немцко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 2 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ; ред. И. М. Игнатенко [и др.]. – Минск : Беларусь, 1984. – Т. 1. – 591 с.

8. *Павлова, Е. Я.* Личный состав партизанских формирований Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941–1944 гг.): источники и методы анализа : автореф. … дис. канд. ист. наук : 07.00.09 / Е. Я. Павлова ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2003. – 17 с.

9. *Лукашоў, А. А.* Дыслакацыя партызанскіх фарміраванняў Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны на картаграфічных дакументах Нацыянальнага архіва / А. А. Лукашоў // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2012. – № 1. – С. 40–45.

10. *Нордман, Э. Б.* Не стреляйте в партизан…/ Э. Б. Нордман. – Минск : Беларусь, 2007. – 198 с.

11. НАРБ. – Ф. 4-п. Оп. 33а. Д. 146. Л. 1–3 / Приказ № 00189 Народного Комиссара обороны СССР «О задачах партизанского движения», 5 сент. 1942 г.

12. *Лемешонок, В. И.* Идейно-политическая работа Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны / В. И. Лемешонок. – Минск : Беларусь, 1988. – 220 с.

13. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память: в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 1. – 480 с.

14. Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; А. М. Літвін [і інш.]. – Мінск : Выш. школа, 2012. – 711 с.

15. *Тозик, А. А.* В дни суровых испытаний: Укрепление рядов КП(б)Б в условиях подполья в годы Великой Отечественной войны (1941–1944) / А. А. Тозик. – Минск : БГУ, 1981. – 160 с.

16. *Жумарь, С. В.* Оккупационная периодическая печать на территории Белоруссии в годы Великой Отечественной войны / С. В. Жумарь. – Минск: БелНИЦДААД, 1996. – 284 с.

17. *Жылінскі, М. Г.* Дзейнасць партызан і падпольшчыкаў Беларусі па зрыве германскіх планаў у галіне адукацыі / М. Г. Жылінскі // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2009. – № 2. – С. 4–14.

**Л. С. Скрабіна**

## АБ ЛЁСЕ ПОЛЬСКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ Т. КАСЦЮШКІ

У друку ўжо не раз асвятлялася дзейнасць польскага партызанскага атрада імя Т. Касцюшкі пад камандаваннем паручніка К. Мілашэўскага [1]. Гэты атрад адыграў асабліва прыкметную ролю ў развіцці польскага ўзброенага падполля ў Навагрудскай акрузе Арміі Краёвай (АК).

Перш чым перайсці да разгляду найбольш драматычных старонак гісторыі вышэй згаданага атрада, неабходна зазначыць, што доўгі час савецкія гісторыкі ацэньвалі АК на тэрыторыі Заходняй Беларусі, як варожую сілу, якая перашкаджала весці барацьбу з Германіяй, накіроўваючы вастрыё сваіх выступленняў супраць савецкіх партызан. Такі спрошчаны